*УДК 821.161.3-311.6*М.Гарэцкі:821.161.1-311.6*Л.Толстой*

**А. П. Шукаловіч**
***Навук. кір. – А. В. Брадзіхіна, канд. філал. навук, дацэнт***

# ТЫПАЛАГІЧНЫЯ ПАРАЛЕЛІ ЗАПІСАК «НА ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЕ» М. ГАРЭЦКАГА І «СЕВАСТОПОЛЬСКИХ РАССКАЗОВ» Л. ТАЛСТОГА

*У артыкуле на прыкладзе твораў М. Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне» і Л. Талстога «Севастопольские рассказы» разглядаюцца найбольш яскравыя тыпалагічныя перасячэнні ва ўвасабленні пісьменнікамі ваеннай праблематыкі. Аўтар прыходзіць да высновы пра падкрэсленую ўвагу абодвух творцаў да абсурднасці сітуацый у паказе баявых дзеянняў, да праблемы выжывання салдата ва ўмовах акопнага побыту, да асэнсавання духоўнай сутнасці герояў на вайне; пра антыгуманны характар ваенных баталій.*

Пісьменнікі з усіх краін свету паказвалі жахі акопных будняў па- рознаму. Вайна Э.-М. Рэмарка была напоўнена страхам за будучае, вайна Э. Хэмінгуэя – думкамі аб смерці, А. Барбюса – суцэльным агнѐм, што абпаліў душы і жыццѐ людзей, у вайне Л. Талстога галоўнае – ідэя бессэнсоўнасці. М. Гарэцкі апісаў сваю вайну, яго рэальнасць адрозная ад іншых пісьменнікаў, бо трагедыю, што ўварвалася ў жыццѐ салдат, немагчыма апісаць аднолькава. Тым не менш у творах кожнага з пералічаных аўтараў можна знайсці мастацкія перасячэнні, абумоўленыя не запазычваннем, а зададзеным агульным кантэкстам, часам і абставінамі, пра якія распавядаецца ў творах.

Для навуковага даследавання дыялогу паміж творамі розных аўтараў і літаратур неабходна кіравацца прынцыпамі кампаратывітстыкі. Пад апошняй разумеецца раздзел літаратуразнаўства, аб‘ектам вывучэння якога з‘яўляецца супастаўленне літаратурных з‘яў. Асноўны метад кампаратывістыкі – параўнанне, высвятленне агульнага і адрознага, прычым апошняе падразумявае нацыянальны і індывідуальна-аўтарскі складнік.

Разглядаючы ваенную прозу М. Гарэцкага ў еўрапейскім кантэксце, трэба звярнуць асаблівую ўвагу на яе тыпалагічныя



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паралелі з творчасцю Л. Талстога, а дакладней – з цыклам апавяданняў «Севастопольские рассказы». Абодва аўтары – добраахвотнікі, што патрапілі ў вір вайны па ўласным жаданні. Аб‘ядноўвае пісьменнікаў і цяга да падрабязнага занатавання ўсяго, што адбываецца навокал, з мэтай данесці да ўлады, салдат, звычайных людзей ідэю бессэнсоўнасці бясконцых ваенных баталій. У творчасці абодвух аўтараў адлюстраванне вайны набывае некалькі праекцый, што пашыраюць яе семантычна-вобразнае напаўненне. Разгледзім некаторыя з іх.

Найперш вайна паказваецца як поле бою. Як у беларускага, так і ў рускага аўтараў заўважаецца пэўная асаблівасць – сярод усіх дзеянняў, што адбываюцца ў творах, ключавое месца належыць апісанню бою. Прычым апошні ўспрымаецца як з‘ява механічная, дзе вораг нападае на ворага, ляцяць кулі, грукочуць бомбы, а разам з імі бягуць у атаку і паміраюць салдаты. Адрозніваюцца гэтыя апісанні

толькі стылем, індывідуальнай творчай манерай саміх аўтараў (усѐ жі жанры твораў розныя). Прычым стратэгія ваенных баталій з пункта погляду логікі мірнага чалавека нярэдка даходзіць да абсурду. Так, у эпізодзе «Севастопольских рассказов» Л. Талстога супрацьлеглыя ваюючыя бакі зрабілі перапынак паміж боем, разам жартавалі і расказвалі «ворагам» гісторыі, а потым: «Белые тряпки спрятаны, и снова свистят орудия смерти и страданий, снова льется честная, невинная кровь и слышатся стоны и проклятия» [1, с. 45]. Падобныя сцэны неаднаразова сустракаюцца і ў творы «На імперыялістычнай вайне» М. Гарэцкага.

Другое аблічча вайны – салдацкі побыт, дзе вораг – бруд, антысанітарыя. Патрэбна заўважыць, што падобная праблема мела надзвычайную актуальнасць у мастацкай сістэме як М. Гарэцкага, Л. Талстога, так і А. Барбюса. Пісьменнікаў і іх персанажаў хвалявалі, у першую чаргу, не сілы праціўніка, а зусім іншыя ворагі – бруд, насякомыя, інфекцыі, хваробы, што ўзнікаюць з гэтай прычыны. Героі твора вядуць вайну з акаляючым асяроддзем, дзе салдат у чарговы раз з‘яўляецца ахвярай.

Вялікая колькасць такіх апісанняў у тэкстах цалкам апраўданая, бо, па словах М. Мушынскага, «адна з асноўных, стрыжнявых ліній
–Запісак салдата...‖ – адлюстраванне вайны ва ўсім яе суровым абліччы» [2, с. 349]. Няўвага да тых, хто змагаецца за свабоду краіны, народаў, у сукупнасці з палымянымі лозунгамі,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

што вырываліся з вуснаў камандзіраў, прыводзіць да таго, што салдаты, акрываўленыя, знясіленыя брудам, белымі вошамі, нясцерпным свербам, недахопам вады і ежы, жадаюць хутчэйшага вызвалення, шалеюць і пакутуюць ад нечалавечых умоў. Адзінае выйсце з гэтага становішча для герояў – не думаць, цярпець: «На адну рэч хапае слоў:
–звяры‖, –звяры‖, –звяры‖ ці, каб не траціць фігуральных выразаў на паскудства, проста – буйныя белыя вошы. На нагах, на спіне, усюды. Поўзаюць, варушацца. Можна здурнець» [3, с. 56]. А. Адамовіч слушна адзначае: «…але нязменным застанецца галоўнае, і якраз яно і робіць франтавыя запісы Гарэцкага сапраўднаю літаратурай: непасрэднасць і блізкасць усяго, што ѐсць бой, смерць, голад, холад, пакутлівы страх і сорам за страх, усяго, што ѐсць вайна» [4, с. 46].

Наступнае ўвасабленне вайны ў творах беларускага і рускага пісьменнікаў – вайна як бітва сотні Напалеонаў. Сіндром Напалеона, што стаў прычынай вар‘яцтва безлічы камандзіраў і салдат, – яшчэ адна паралель паміж славянскімі аўтарамі. Георгіеўскі крыж выступае ганаровай узнагародай «героям», якіх, па сутнасці, няма. М. Гарэцкі піша пра гэта: «Якія ж мы героі… Георгіеўскія кавалеры? Каб не баяліся кары, каб не вайсковая дысцыпліна, ніводзін бы з нас, ні я, ні Пашын, ні Беленькі, пэўна, з месца не зрушыліся б. Дый хадзілі па чароду, часам войстра спіраючыся, каму ісці…» [3, с. 78]. М. Мушынскі слушна адзначае: «Гарэцкі быў сведкам сапраўднай мужнасці і гераізму галодных, дрэнна апранутых салдат дрэнна ўзброенай арміі, якой камандавалі няздарныя генералы» [2, с. 355– 356]. Калі «героі» М. Гарэцкага больш простыя ў сваіх немудрагелістых памкненнях, іх мэта – проста выжыць, то персанажы Л. Талстога апантаныя мэтай атрымаць узнагароду, чарговыя зорачкі, не выбіраючы сродкаў і даходзячы ў яе дасягненні да самых агідных жорсткасцей.

Нярэдка вайна паўстае своеасаблівай гульнѐй у творах «На імперыялістычнай вайне» і «Севастопольские рассказы». У свядомасці герояў, змешчаных у нечалавечыя ўмовы, адбываецца пэўная гульня, пастаноўка, дзе кожны з‘яўляецца галоўнай дзеючай асобай спектакля пад назвай «Гульня са Смерцю». Салдаты, затойваючы дыханнне, чакаюць снарадаў, і кожны патаемна жадае, каб той упаў бліжэй, каб потым бадзѐра бегчы далей, пераадольваючы чарговыя этапы жорсткага квэсту. У выніку можна пераможна ўскрыкнуць: «Я перамог Смерць!», – альбо ўпасці нежывому на зямлю, не ў сілах усвядоміць паразу.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Героі самаахвярна кідаюцца на амбразуры, каб прынесці жаданую перамогу «сваім», тым самым хоць і паміраюць, але ўсѐ ж такі ў выніку абыгрываюць Смерць і зноўку паўстаюць пераможцамі: «Вы находите какую-то особенную прелесть в опасности, в этой игре жизнью и смертью» [1, с. 26].

Яшчэ адзін аспект вайны, на якім засяроджваюцца беларускі і рускі пісьменнікі, – вайна як змаганне за свабоду ўласнай краіны. Як Лявон М. Гарэцкага, так і Валодзя з апошняй часткі твора Л. Талстога любяць сваю краіну і не разумеюць, чаму яна павінна цярпець наступствы глупстваў і недарэчных ахвяраў адвечных змагароў за ілюзорныя каштоўнасці – людзей ад улады. Валодзя ідзе ў войска за старэйшым братам з мэтай змагацца супраць ворага дзеля свабоды сваѐй краіны. Лявон не бачыць сэнсу ў вайне (у творы ѐн выступае як больш мудры, назіральны і разважлівы чалавек), але ж ѐн хвалюецца за сваю краіну, яе культуру і яе волю: «Калі так, як кажаце, дык Беларусь павінна быць. Што ж, ці мы чым горшыя за другіх? Гэта добра, гэта справядліва: ―Што трэба свабоды, зямлі чалавеку…‖ Гэта лоўка!» [3, с. 26].

Такім чынам, становіцца відавочным, што вайна ў адлюстраванні М. Гарэцкага і Л. Талстога набывае ўсе рысы Апакаліпсісу, што прыносіць з сабой хваробы, голад і смерць. Тыпалагічныя паралелі

ў творах М. Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне» і Л. Талстога «Севастопольские рассказы» назіраюцца не толькі праз падкрэсленую рэпрэзентацыю вайны як антыгуманнай дзеі, але ў розных іншых аспектах, што тычацца не толькі зместу твораў, але і яго фармальнага плана (аўтабіяграфічнасць, аповед ад першай асобы, падзел твораў на часткі, што размешчаны ў храналагічным парадку і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Спіс літаратуры**

1 Толстой, Л. Севастопольские рассказы / Лев Толстой. – М.: Искатель, 2017. – 96 с.

2 Мушынскі, М. Каментарыі / М. Мушынскі // Гарэцкі, М. Збор твораў: у 4-х т. Т. 3. – На імперыялістычнай вайне; Віленскія камунары / Максім Гарэцкі. – Мінск: Маст. літ., 1985. – С. 345 – 369.

3 Гарэцкі, М. На імперыялістычнай вайне: Запіскі салдата 2-й батарэі N-скай артылерыйскай брыгады Лявона Задумы / Максім Гарэцкі. – Мінск: Юнацтва, 1987. – 175 с.

4 Адамовіч, А. Браму скарбаў сваіх адчыняю… / Адамовіч Алесь. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1980. – 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ